Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_____________А. А. Корбут
«____» ____________ 2016 г.

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

## Раздзел II
## Методыка выкладання спецдысцыплін

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. Г. Фядотаў*, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. А. Грачова*, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;
*М. Л. Кузьмініч*, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў ДУА «Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 27.10.2015 г.);
*саветам* факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 26.11.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 21.12.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Г. Фядотаў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання спецдысцыплін» праводзіцца згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках).

*Мэта* экзамену – ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых студэнтамі за перыяд вывучэння вучэбных дысцыплін «Педагогіка», «Прафесійная педагогіка», «Методыка выкладання спецдысцыплін» і ўключае ў сябе пытанні псіхолага-педагагічнай накіраванасці тэарэтычнага і практычнага характару.

Прапанаваная праграма з’яўляецца састаўной часткай дзяржаўнага экзамену па вучэбнай дысцыпліне «Педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін». Яна дапаўняе праверку агульных псіхолага-педагагічных ведаў, выяўленне якасці засваення методыкі выкладання спецыяльных вучэбных дысцыплін, якія маюць непасрэднае дачыненне да прафесійнай дзейнасці рэжысёра-педагога.

Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі развіваюцца і фарміруюцца наступныя акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі спецыяліста:

– умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

– валодаць даследчымі навыкамі;

– умець працаваць самастойна;

– быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;

– валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;

– умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

– валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі;

– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

– валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

– выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў;
– карыстацца сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый і глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі;
– праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і іншых установах;
– наладжваць творчыя семінары, круглыя сталы для дзеячаў культуры і мастацтва падчас падрыхтоўкі свята;
– кансультаваць кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых, спартыўных, ваенных і іншых калектываў падчас падрыхтоўкі творчых праектаў;
– праводзіць адбор рэпертуару мастацкіх твораў з мэтай захавання і трансляцыі народнай творчасці;
– выкарыстоўваць новыя кірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях;
– весці перамовы па арганізацыі выканальніцкай дзейнасці;
– карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі па ўдакладненні сучасных умоў, зместу і сацыяльнай запатрабаванасці выканальніцкай і рэжысёрскай дзейнасці;
– распрацоўваць фальклорна-этнаграфічны матэрыял традыцыйных абрадаў і свят, на іх аснове праводзіць рэстаўрацыю, рэканструкцыю ці трансфармацыю ў сучасным свяце;
– ажыццяўляць на аснове культурна-гістарычнай спадчыны новыя святочныя формаўтварэнні ў сучасным сацыякультурным асяроддзі;
– ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства;
– аналізаваць гістарычныя аспекты, перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці, святочнай культуры;
– вызначаць актуальныя праблемы ў галіне рэжысуры свят і прапаноўваць шляхі іх вырашэння.

Падчас экзамену правяраецца наяўнасць у будучых спецыялістаў сучаснага комплекснага метадалагічнага і мастацка-творчага мыслення, узровень валодання сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі, уменне выбару аптымальнай стратэгіі выкладання спецдысцыплін.

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў форме вуснага адказу студэнта на тры пытанні білета, два з якіх датычацца ведаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галіны агульнай педагогікі і адно – вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін».

На падрыхтоўку да адказу на дзяржаўным экзамене кожнаму студэнту адводзіцца не менш за 30 хвілін, на здачу дзяржаўнага экзамену адводзіцца да 30 хвілін. Для ўдакладнення экзаменацыйнай адзнакі студэнту членамі ДЭК могуць задавацца адпавядаючыя праграме дадатковыя пытанні. Вынікі здачы дзяржаўнага экзамену апавяшчаюцца ў той жа дзень пасля афармлення адпаведных пратаколаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ЭКЗАМЕНУ

*1. Прафесійныя і светапоглядныя патрабаванні да асобы мастацкага кіраўніка і педагога творчага калектыву*

Асоба і калектыў у сістэме выхавання. Сутнасць паняцця прафесійнай прыдатнасці да педагагічнай дзейнасці. Творчасць як аснова развіцця калектыву і кожнага ўдзельніка паасобку. Крэатыўнасць, арганізацыйныя здольнасці, эмацыянальна-валявое ўздзеянне – неабходныя якасці сучаснага педагога. Светапогляд выкладчыка і творчы працэс.

*2. Дыягностыка і развіццё акцёрскіх здольнасцей у выхаванцаў featureзнага ўзросту*

Комплекс прыроджаных і набытых якасцей, неабходных для заняткаў творчасцю. Пасіўныя і актыўныя сродкі дыягностыкі творчых здольнасцей аматараў. Практыкаванні для развіцця акцёрскіх здольнасцей.

*3. Прыёмы выхавання маральна-этычных норм паводзін і дысцыпліны ў творчым калектыве*

Галоўныя складнікі этыкі артыста. Этычныя асновы сістэмы К. С. Станіслаўскага. Тэатр – калектыўны мастак, кафедра і прапагандыст вялікіх ідэалаў.

*4. Паняцце студыйнасці. Мастацка-творчыя і псіхолага-педагагічныя асаблівасці студыйнага працэсу*

Асновы студыйнасці ў творчасці. Прынцыпы студыйнага самакіравання. Этычныя нормы студыі. «Няма дысцыпліны – няма студыі!» Калектыў аднадумцаў і індывідуальнасцей. Студыя – прастора эксперымента і творчага пошуку.

*5. Статут творчага калектыву, студыі як сродак выхавання маральна-этычных норм жыцця і творчасці*

Вызначэнне мэты, задач і духоўных арыенціраў дзейнасці калектыву, студыі. Шляхі стварэння калектыву аднадумцаў. Творчая атмасфера калектыву. Статут – звод этычных норм, абавязковых для выканання кожным членам творчага калектыву. Стварэнне статута творчага калектыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6. Акцёрскі трэнінг як вядучы кампанент навучальнага працэсу творчага калектыву*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Асноўныя задачы трэнінгу: развіццё органаў пачуццяў і ўдасканаленне механізмаў успрымання; удасканаленне вобразнай памяці і асваенне механізмаў мыслення і мовы.

*7. Методыка выкладання вучэбнай дысцыпліны «Слоўнае дзеянне» на прыкладзе тэмы «Тэхніка мовы: развіццё дыкцыі»*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Моўны слых у выхаванні дыкцыйных навыкаў. Артыкуляцыйная гімнастыка (практыкаванні для вуснаў і языка). Каардынацыя работы знешняй і ўнутранай артыкуляцыі. Выхаванне дыкцыйнай чысціні і выразнасці. Практыкаванні па мове, голасе, дыханні з рэальнымі рэчамі. Індывідуальныя парады і практыкаванні па выпраўленні недахопаў дыкцыі.

*8. Методыка выкладання вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства акцёра» на прыкладзе тэмы «Сцэнічная ўвага»*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Віды ўвагі. Увага як сродак пазнання навакольнай рэчаіснасці. Увага жыццёвая і сцэнічная. Увага адвольная і міжвольная. Увага і дзеянне. Развіццё сцэнічнай увагі.

*9. Прырода і законы акцёрскай творчасці, метады кіраўніцтва імі*

Прырода акцёрскай творчасці. Адзінства фізічнага і псіхічнага, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў творчасці артыста. Асноўныя прынцыпы выхавання артыста. Паняцце ўнутранай і знешняй тэхнікі. Спецыфіка творчасці эстраднага артыста.

*10. Педагагічнае кураўніцтва працэсамі самавыхавання і самаадукацыі ўдзельнікаў творчага калектыву*

Выпрацоўка патрэбы ў штодзённай самаадукацыі і набыцці новых мастацкіх уражанняў у ўдзельнікаў калектыву. Назіранне і назапашванне «творчага багажу». Этычныя законы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці. Дысцыпліна і творчы рэжым – неабходныя элементы жыцця мастацкага калектыву. Фальклор як сродак далучэння дзяцей да вытокаў народнай культуры. Сяброўскае адзінства калектыву розных індывідуальнасцей. Тры перспектывы калектыву: блізкая, сярэдняя, далёкая.

*11. Прыёмы стварэння творчага самаадчування выканаўцы*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на урок. Знешняе сцэнічнае самаадчуванне. Агульнае сцэнічнае самаадчуванне. Публічнасць творчасці і яе ўплыў на самаадчуванне артыста. Сцэнічная ўвага – галоўны сродак выпрацоўкі дакладнага сцэнічнага самаадчування. Свабода ўнутраная і знешняя. Знешняя свабода як вынік свабоды ўнутранай. Сцэнічны «заціск» і спосабы яго пераадольвання. Псіхатэхніка ў сістэме К. С. Станіслаўскага як сродак стварэння ўнутранага сцэнічнага самаадчування.

*12. Выкарыстанне разнастайных тэатральных практык псіхафізічнага ўдасканалення артыстычнай тэхнікі (К. С. Станіслаўскі, М. Чэхаў, У. Э. Меерхольд, Е. Гратоўскі)*

Развіццё ўнутранага творчага апарату артыста: увага, уяўленне, зносіны, эмацыянальная памяць, праўда і вера ў сістэме К. С. Станіслаўскага. Рухавікі псіхічнага жыцця: розум, воля, пачуцці. «Псіхалагічны жэст» Міхаіла Чэхава. Выпраменьванне. Партытура атмасфер. Біямеханіка У. Э. Меерхольда. Асаблівасці трэнінгу Е. Гратоўскага.

*13. Методыка выкладання вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства акцёра» на прыкладзе тэмы «Дзеянне як вядучы элемент артыстычнай псіхатэхнікі»*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Мастацтва артыста – мастацтва сцэнічнага дзеяння. Віды і характарыстыка дзеяння. Дзеянне актыўнае, мэтанакіраванае, арганічнае. Валявое паходжанне. Наяўнасць мэты. Дзеянне як узбуджальнік пачуцця. Віды дзеяння.Ператварэнне псіхічных задач у фізічныя. Мімічнае і моўнае дзеянне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Методыка выкладання вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства акцёра» на прыкладзе тэмы «Роля прапанаваных абставін у стварэнні сцэнічнага вобраза»*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Магічнае «калі б». Выхаванне сцэнічнай веры. Сцэнічнае апраўданне – шлях да сцэнічнай веры. Логіка і паслядоўнасць дзеянняў. Прапанаваныя абставіны. Непасрэднасць і вера ў прыдуманыя абставіны як важныя элементы прафесійнага выхавання акцёра.

*15. Методыка правядзення рэпетыцый з удзельнікамі творчага калектыву*

Сакрэты правядзення першай рэпетыцыі. Атмасфера і дысцыпліна рэпетыцыі. «Рэпетыцыя – любоў мая» – А. В. Эфрас. Застольныя рэпетыцыі, іх эвалюцыя ў творчасці К. С. Станіслаўскага. Рэпетыцыі ў выгарадках, зводныя, мантажныя, генеральная рэпетыцыі. Спецыфіка правядзення рэпетыцый святочных дзей.

*16. Работа з выканаўцамі згодна метаду дзейснага аналізу К. С. Станіслаўскага*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Агульныя прынцыпы дзейснага аналізу п’есы, ролі. Прапанаваныя абставіны. Ацэнка фактаў. Звышзадача і скразное дзеянне. Эцюдныя рэпетыцыі. Праца М. О. Кнебель «О действенном анализе пьесы и роли».

*17. Метады дыягностыкі і спосабы карэкцыі моўных недахопаў*

Культура мовы ўдзельнікаў творчага калектыву. Патрабаванні да мовы артыстаў. Прынцыпы аналізу моўных недахопаў. Класіфікацыя моўных недахопаў. Недахопы ў вымаўленні асобных гукаў і літар, прыёмы іх пастаноўкі.

*18. Методыка правядзення заняткаў вучэбнай дысцыпліны «Слоўнае дзеянне» на прыкладзе тэмы «Работа над паэтычным творам»*

Паэзія ў развіцці лірычных, грамадзянскіх пачуццяў чалавека. Рыфма і яе арганізуючая роля ў паэтычным творы. Фактары, якія вызначаюць рытм верша. Страфа і яе разнастайнасць: двухрадкоўе, дзесяцірадкоўе, анегінская страфа. Сане-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ты. Балада. Гекзаметр. Характар зносін у лірычным матэрыяле. Выхаванне навыку выканання вершаванага матэрыялу ў суправаджэнні музыкі.

*19. Публікацыі, падручнікі і метадычныя дапаможнікі па спецыяльных вучэбных дысцыплінах «Рэжысура» і «Майстэрства акцёра»*

Падручнікі, дапаможнікі і артыкулы, рэкамендаваныя для вывучэння і выкладання дысцыплін «Майстэрства акцёра», «Слоўнае дзеянне», «Гульнявая дзейнасць у свяце». Манаграфіі вядомых артыстаў і сусветна вядомых майстроў рэжысуры. Мастацказнаўчыя слоўнікі, даведнікі і энцыклапедыі. Літаратура псіхолага-педагагічнага кірунку. Інтэрнэт-рэсурсы як сродак пашырэння крыніц папаўнення ведаў аб сучасным стане відовішчных мастацтваў.

*20. Выяўленне і развіццё пластычных здольнасцей удзельнікаў творчага калектыву*

Пластычная гігіена відовішча. Пластычная выразнасць – важны складальнік мастацкай творчасці выканаўцы. Агульны малюнак і індывідуальная пластыка. Урокі пантамімы і «чацвёртая сцяна». Ракурсы. Элементы спартыўнай тэхнікі ў структуры пластычнай выразнасці выканаўцы. Харэаграфія як сродак выхавання пластычнай выразнасці артыста.

*21. Методыка арганізацыі рэпетыцыйнага працэсу з рознымі катэгорыямі выканаўцаў (прафесіяналы, аматары, дзеці)*

Спецыфічныя асаблівасці правядзення рэпетыцый святочных дзей. Рэпетыцыі з прафесіянальнымі артыстамі і калектывамі. Рэпетыцыйная работа з аматарамі. Рэпетыцыі з дзіцячымі калектывамі і выканаўцамі.

*22. Методыка выкладання вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства акцёра» на прыкладзе тэмы «Мізансцэна як сродак стварэння выразнасці сцэнічнага вобраза»*

Этапы падрыхтоўкі да заняткаў. Від і форма заняткаў. Зачын заняткаў, настрой на ўрок. Мізансцэна – выразны сродак акцёрскага і рэжысёрскага мастацтваў. Мізансцэна як сродак кампазіцыйнай арганізацыі сцэнічнай прасторы. Законы мізансцэніравання. Дынаміка і тэмпарытм мізансцэны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*23. Тэорыя і методыка работы з выканаўцам над знешняй і ўнутранай тэхнікай слоўнага дзеяння*

Мэтавыя ўстаноўкі практыкаванняў галасамоўнага трэнінгу. Унутраная і знешняя моўная тэхніка выканаўцы. Паэтапнасць фарміравання выканальніцкіх навыкаў. Прынцып комплекснай трэніроўкі ўнутранай і знешняй тэхнікі выканаўцы.

*24. Методыка арганізацыі і правядзення гульняў з дзецьмі і падлеткамі*

Узроставыя асаблівасці правядзення гульняў для дзяцей і падлеткаў. Здольнасць тлумачыць умовы гульні для дзіцячага разумення. Асноўныя прыкметы гульні. Падбор гульняў – падзейны рад. Прынцыпы стварэння гульнявой праграмы. Пошук сюжэта гульнявой праграмы. Умовы стварэння гульнявой атмасферы. Прыёмы далучэння гледачоў да ўдзелу ў гульнях.

*25. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу з вялікімі групамі выканаўцаў-аматараў*

Працэс падрыхтоўкі рэжысёра да рэпетыцый з вялікімі групамі выканаўцаў. Стварэнне схем і графічных эскізаў найбольш значных мізансцэн відовішча. Структурныя элементы рэпетыцыі. Псіхолага-педагагічны аспект зносін з вялікімі групамі выканаўцаў-аматараў.

*26. Змест і структура заняткаў па вучэбнай дысцыпліне «Традыцыйная святочная культура беларусаў»*

Беларускія народныя абрады і святы каляндарнага цыкла. Раскрыццё генетычнай асновы і тэндэнцый развіцця традыцыйных і сучасных свят. Выяўленне працэсаў пераемнасці, зменлівасці і ўстойлівасці абраднасці беларусаў. Вызначэнне прычын, якія перашкаджаюць распаўсюджванню прагрэсіўных народных традыцый. Шляхі павышэння выхаваўчага значэння свят і выкарыстанне культурнай спадчыны мінулых пакаленняў у сучаснай святочнай культуры Беларусі.

*27. Педагагічны аспект правядзення рэпетыцый са спецыфічнымі групамі выканаўцаў (спартсмены, вайскоўцы, людзі з асаблівасцямі псіхафізічнага статусу)*

Кампетэнтнасць у веданні асаблівасцей прафесійнай дзейнасці разнастайных удзельнікаў відовішча. Вызначэнне псіха-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лагічнага партрэта асобных груп выканаўцаў. Педагагічны аспект правядзення рэпетыцый з выканаўцамі, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага статусу; кансультацыі з педагогамі-дэфектолагамі.

*28. Прынцыпы арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў дзіцячым фальклорным калектыве*

Спецыфіка вучэбна-выхаваўчай работы ў дзіцячым і падлеткавым фальклорным калектыве. Праблемы творчага лідарства і міжасобасных канфліктаў, непазбежных у творчым калектыве, формы і метады вучэбна-выхаваўчай работы. Улік узроставых і індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей дзяцей і падлеткаў у творчай дзейнасці. Выхаваўчая функцыя рэпертуару. Педагагічныя патрабаванні да рэпертуару як сродку выхавання выканаўцаў і гледачоў. Выяўленне і развіццё творчай індывідуальнасці вучня – асноўны напрамак дзейнасці кіраўніка калектыву.

*29. Методыка і прыёмы галасамоўнага трэнінгу*

Прыёмы трэнінгу, якія забяспечваюць апасродкаванае ўздзеянне на работу галасамоўнага апарату. Метад гульні. Выклічнікі ў развіцці голасу. Прыёмы імітацыі і гукапераймання. Трэніроўка мовы ў руху. Мэтавыя ўстаноўкі практыкаванняў.

*30. Кіраўнік і педагог творчага калектыву ў ролі вучня*

Устойлівы навык да самаадукацыі і самаўдасканалення. Работа па павышэнні прафесійнай кампетэнтнасці. Развіццё і ўдасканаленне мастацкага густу. Выхаванне каштоўнасных арыентацый на традыцыі сусветнай і айчыннай культуры. Праходжанне прафесійнай перападрыхтоўкі па сваёй спецыяльнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ

*Асноўная*

1. *Аляхновіч, А. М.* Беларускі музычны фальклор / А. М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 336 с.

2. *Гин, А. А.* Приемы педагогической техники / А. А. Гин. – М. : Вита-Пресс, 2011. – 112 с.

3. *Гиппиус, С. В.* Актерский тренинг. Гимнастика чувств / С. В. Гиппиус. – СПб. : Прайм–ЕВРОЗНАК, 2006. – 377, [7] с. : ил.

4. *Гройсман, А. Л.* Личность, творчество, регуляция состояний: Руководство по театральной и паратеатральной психологии / А. Л. Гройсман. – М. : Магистр, 1998. – 114 с.

5. *Гротовский, Е.* От Бедного театра к Искусству-проводнику / Е. Гротовский ; пер. с пол., сост., вступ. ст., примеч. Н. З. Башинджагян. – М. : Артист. Режиссер. Театр, 2003. – 351 с.

6. *Варламова, Е. П.* Психология творческой уникальности человека / Е. П. Варламова, С. Ю. Степанов. – М. : Ин-т психологии РАН, 2002. – 256 с.

7. *Ершова, А. П.* Режиссура урока, общения и поведения учителя / А. П. Ершова, В. М. Букатов. – М. : Флинта, 2010. – 344 с.

8. *Захава, Б. Е.* Мастерство актера и режиссера : учеб. пособие для спец. учеб. заведений культуры и искусства / Б. Е. Захава. – Изд. 4-е, испр. и доп. – М. : Просвещение, 1978. – 334 с.

9. *Каляда, А. А.* Сцэнічная мова / А. А. Каляда. – Мінск : Выш. шк., 1989. – 270 с.

10. *Кипнис, М.* Актерский тренинг. Более 100 игр, упражнений и этюдов, которые помогут вам стать первоклассным актером / М. Кипнис. – М. : АСТ : Прайм–ЕВРОЗНАК, 2008. – 249, [7] с. : ил.

11. *Кнебель, М. О.* Поэзия педагогики / М. О. Кнебель. – [Ред. Н. А. Крымова ; предисл. Г. Товстоногова ; ил. Ю. Пименова. – 2-е изд.]. – М. : ВТО, 1984. – 526 с. : ил.

12. *Кнебель, М. О.* О действенном анализе пьесы и роли / М. О. Кнебель. – 3-е изд. – М. : Искусство, 1982. – 119 с.

13. *Конаржевский, Ю. А.* Анализ урока / Ю. А. Конаржевский. – М. : Обр. центр «Педагогический поиск», 2003. – 336 с.

14. *Корогодский, З. Я.* Первый год. Начало / З. Я. Корогодский. – М. : Сов. Россия, 1974. – 128 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*15. Корогодский, З. Я.* Первый год. Продолжение / З. Я. Корогодский. – М. : Сов. Россия, 1974. – 112 с.

*16. Кристи, Г. В.* Воспитание актера школы Станиславского / Г. В. Кристи. – М. : Искусство, 1968. – 455 с.

*17. Малахова, И. А.* Развитие креативности личности в социокультурной сфере: педагогический аспект / И. А. Малахова. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2006. – 327 с.

*18. Мейерхольд, В. Э.* Статьи. Письма. Речи. Беседы : в 2 т. / В. Э. Мейерхольд. – М. : Искусство, 1968.

*19. Немеровский, А. Б.* Пластическая выразительность актера : учеб. пособие для театр. вузов / А. Б. Немеровский. – М. : Искусство, 1976. – 128 с.

*20. Новицкая, Л. П.* Изучение элементов актерского мастерства. Тренинг и муштра / Л. П. Новицкая. – М. : Сов. Россия, 1969. – 272 с.

*21. Петрова, А.* Сценическая речь / А. Петрова. – М. : Искусство, 1981. – 191 с.

*22. Рождественская, Н. В*. Проблемы и поиски в изучении художественных способностей / Н. В. Рождественская // Психология художественного творчества. – Минск : Хорвест, 1999. – 185 с.

*23. Сарабьян, Э.* Актерский тренинг по системе Г. А. Товстоногова / Э. Сарабьян. – М. : АСТ : Владимир ВКТ, 2010. – 191 с.

*24. Сарабьян, Э.* Актерский тренинг по системе Станиславского. Настрой. Состояния. Партнер. Ситуации / Э. Сарабьян. – М. : АСТ, 2011. – 185 с.

*25. Селевко, Г. К.* Современные образовательные технологии: учеб. пособие / Г. К. Селевко. – М. : Нар. образование, 1998. – 256 с.

*26. Станиславский, К. С.* Актер должен уметь говорить : собр. соч. : в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1954. – Т. 1. – С. 365–371.

*27. Станиславский, К. С.* Работа актера над собой в творческом процессе переживания / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1951. – 665 с.

*28. Станиславский, К. С.* Моя жизнь в искусстве / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1962. – 575 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*29. Станиславский, К. С.* Режиссерские экземпляры К. С. Станиславского, 1898–1930 : в 6 т. / К. С. Станиславский ; вступ. ст. Ю. А. Завадского. – М. : Искусство, 1980.

*30. Тришин, В.* Студийный метод воспитания актера / В. Тришин. – М. : ВЦХТ «Я вхожу в мир искусств», 2009. – 13 с.

*31. Сулимов, М. В*. Режиссер наедине с пьесой / М. В. Сулимов. – СПб., 1992. – 185 с.

*32. Товстоногов, Г. А*. Зеркало сцены. Статьи. Записи репетиций : в 2 кн. / Г. А. Товстоногов ; сост. Ю. С. Рыбаков. – Л. : Искусство, 1980. – 311 с.

*33. Туманишвили, М. И.* Введение в режиссуру (Пока не началась репетиция) / М. И. Туманишвили. – М., 1976. – 311 с.

*34. Чехов, М.* Об искусстве актера / М. Чехов. – М. : Искусство, 1999. – 271 с.

*35. Шагидевич*, А. А. Искусство сценической речи / А. А. Шагидевич. – Минск : Белорус. ун-т культуры, 1999. – 284 с.

*36. Шангина, Е. Ф*. Выявление актерских и режиссерских способностей / Е. Ф. Шангина. – М. : Дебют, 1993. – 184 с.

*37. Яковлева, Е. Л.* Психология развития творческого потенциала личности / Е. Л. Яковлева. – М. : МПСИ : ФЛИНТ, 1997. – 224 с.

*Дадатковая*

*1. Аляхновіч*, *А. М.* Фальклор у выхаванні школьнікаў / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 198 с.

*2. Батурина, Г. И.* Нравственное воспитание школьников на народных традициях / Г. И. Батурина, К. Л. Лисова, Г. Ф. Суворова. – М., 2002. – 56 с.

*3. Бруссер, А. М.* Сценическая речь : метод. рек. и практ. задания для начинающих педагогов театр. вузов / А. М. Бруссер. – М. : ВЦХТ, 2008 – 154 с.

*4. Горчаков, Н. М.* Режиссерские уроки К. С. Станиславского / Н. М. Горчаков. – М. : Искусство, 1951. – 564 с.

*5. Грамовіч, І. М.* Методыка работы з фальклорным гуртам: курс лекцый / І. М. Грамовіч, Л. В. Снапкова. – Мінск : БДУКМ, 2009. – 139 с.

*6. Гуд, П. А.* Святы, якія заўжды з намі: гульнявыя праграмы «Ад Каляд да Пакроваў» / П. А. Гуд. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Ершов, П.* Технология актерского искусства / П. Ершов. – М. : ВТО, 1959. – 397 с.

*8. Катышева, Д. Н.* Театр поэта / Д. Н. Катышева. – М. : Сов. Россия, 1989. – 128 с.

*9. Кнебель, М.* Слово в творчестве актера / М. Кнебель. – М. : ВТО, 1970. – 160 с.

*10. Кох, И. Э.* Основы сценического движения / И. Э. Кох. – Л. : Искусство, 1970. – 566 с.

*11. Литосова, М. К.* Профессиональная речь актера и режиссера (терминологические и нетерминологические словосочетания) : учеб. пособие / М. К. Литосова. – М. : ГИТИС, 1989. – 208 с.

*12. Мочалов, Ю.* Композиция сценического пространства (Поэтика мизансцены) / Ю. Мочалов. – М. : Просвещение, 1981. – 239 с.

*13.* Одаренные дети : пер. с англ. / общ. ред. Г. В. Бурменской, В. М. Слуцкого ; предисл. В. М. Слуцкого. – М. : Прогресс, 1991. – 376 с.

*14. Пави, П.* Словарь театра : пер. с фр. / П. Пави. – М. : Прогресс, 1991. – 491 с.

*15. Петров, Н. В.* Режиссура массовых спортивно-художественных представлений / Н. В. Петров. – Л. : Нева, 1987. – 278 с.

*16. Ралько, У. Д.* Верш і мова / У. Д. Ралько. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 263 с.

*17. Рубб, А. А.* Тайна режиссерского замысла / А. А. Рубб // От замысла к воплощению. – М., 1999. – 102 с.

*18. Рубб, А. А.* Феномен эстрадной режиссуры: опыт исследования / А. А. Рубб. – М. : Луч, 2001. – 230 с.

*19. Савкова, З. В.* Искусство литературной композиции и монтажа / З. В. Савкова. – М. : ЛГИК им. Н. К. Крупской, 1985. – 106 с.

*20. Силин, А. Д.* Специфика работы режиссера при постановке массового театрализованного представления под открытым небом и на нетрадиционных сценических площадках / А. Д. Силин. – М. : Просвещение, 1987. – 117 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

**10 балаў** (надзвычай выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковыя сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы дзяржаўнага экзамену, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы; беспамылкова адказаў на ўсе пытанні. Свабодна аперыруе навуковай прафесійнай тэрміналогіяй (у тым ліку на замежнай мове); бездакорна валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы, вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўляе здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўна і глыбока засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку; выказвае свае меркаванні, паказвае жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**9 балаў** (выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковыя сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы дзяржаўнага экзамену; дакладна выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы, вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўляе здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай дысцыпліны; поўна засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**8 балаў** (амаль выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы дзяржаўнага экзамену; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), умее яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; самастойна вырашае складаныя праблемы ў рамках вучэбнай дысцыпліны; засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**7 балаў** (вельмі добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах дзяржаўнага экзамену; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); умее рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; свабодна валодае тыпавымі рашэннямі ў рамках праграмы дзяржаўнага экзамену; засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**6 балаў** (добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па дзяржаўным экзамене; выкарыстоўвае неабходную навуковую тэрміналогію, умее рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; самастойна прымяняе тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засвоіў асноўную літаратуру; умее арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку.

**5 балаў** (амаль добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастатковае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію, правільна адказвае на пытанні; умее выкарыстоўваць інструментарый вучэбнай дысцыпліны ў вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольны самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засвоіў асноўную літаратуру.

**4 балы** (дастаткова здавальняюча) – у студэнта дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; напалову засвоіў асноўную літаратуру, рэкамендаваную вучэбнай праграмай; у некаторых выпадках выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію, лагічна адказвае на пытанні, умее рабіць высновы без істотных памылак; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; у большасці выпадкаў арыентуецца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках вучэбнай дысцыпліны і дае ім ацэнку.

**3 балы** (нездавальняюча) – недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай па вучэбнай дысцыпліне; адказ на пытанні адбываецца з істотнымі памылкамі; недастатковае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; не арыентуецца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках дадзенай вучэбнай дысцыпліны.

**2 балы** (нездавальняюча) – фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных па вучэбнай дысцыпліне; не выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію па вучэбнай дысцыпліне, наяўнасць у адказе грубых памылак.

**1 бал** (нездавальняюча) – адсутнасць ведаў і кампетэнцый у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА**
**І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН**

**Раздзел ІІ**
**Методыка выкладання спецдысцыплін**
*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,77. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ